

# Аляксей БЕЛЫ

**Аляксей Ільіч Белы** нарадзіўся ў 1952 годзе ў вёсцы Міхнавічы Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыў марскую вучэльню ў Карэліі, працаваў матросам на Поўначы на выратавальным параходзе ледакольнага тыпу. Пасля службы ў войску быў памочнікам капітана цеплахода на рачным флоце Беларусі. З 1977 года жыве ў Баранавічах. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы і Кіеўскі інстытут паліталогіі. Працаваў карэспандэнтам, рэдактарам. Паэт, празаік. Вершы публікаваліся ў гарадскіх і абласных газетах, рэспубліканскай газеце «Літаратура і мастацтва», у часопісе «Дыялог», кнізе выбранай беларускай паэзіі «Агледзіны», літаратурным альманаху «Святліца», калектыўным зборніку «Паэзія Берасцейшчыны. Дзядзінец», альманаху «Тэрмапілы» і інш. Аўтар зборнікаў вершаў «Тридцать второе августа», «Невольничьи песни», «Каляровыя сны», «Боскі вецер правінцыі», «Кветкі ў стагах», «Прыватны сектар», «У абдымках дажджу», кнігі прозы «Ад Грыўды да Гандвіка», зборніка вершаў і эсэ «Жыві, дзе ўдосталь ветру» і інш. Піша на беларускай і рускай мовах.

## ГОСЦІ

Далёка недзе выправіцца ўранні,
Ісці ўвесь дзень паўз поле і паўз шаты,
Ды так і не дайсці да скрыжавання,
Адкуль твой шлях вядзе да роднай хаты.

Але ж ты ведаў – шлях той не бясконцы,
Не выклікаў ён у душы трывогу:
Ты разумеў, кіруючы на сонца,
Што сілы хопіць “у адну дарогу”.

***

Караколу прыкладзі да вуха –
І адчуеш подых акіяна…
У заплечнік усё складзеш старанна.
Вецер зноў у ветразі і ў спіну,
Так бы слухаў гэты шум, і слухаў…
…………………………………..
А жанчына ў суме, што падмануць,
І ў самоце, што яе пакінуць…

***

Рукі твае на плячах,
Шолах крынічкі і дрэў.
Сіні агонь у вачах.
Вось я ўжо і згарэў!

***

Ужо не карціна, а толькі лубок:
Не быць Мастаком аратаму.
Кудлаты сабачка бяжыць у твой бок
І за штаніну кратае.

…Чырванее ліхтар – там апошні вагон,
А ў ім болей тыя, хто сее…
Ну, а ты ўсё аблокам бяжыш наўздагон
З лёгкім сумам: а раптам паспею?

## КАФЭ “АЙ”

Пад’ёмнік ёсць, ды, пэўна, лепей пешшу
(І ў ім часамі адчуваеш страх).
Сюды заносіць ветрам толькі лепшых –
У кафэ, што затаілася ў гарах.

Ёсць рызыка не так ступіць на камень
Альбо патрапіць пад круты карніз…
Тут Юрый Візбар бавіў час з сябрамі,
Ляцеў на лыжах, снег узняўшы, уніз.

Хтось і цяпер той снег нагамі месіць,
Не думаючы аб надзённым хлебе…
“Ай” па-балкарску – гэта значыць месяц
(Не каляндарны, не, а той, што ў небе).

…У ліпені тут, як і ўсюды, лета,
Ёсць месца сціплым кветачкам расці.
Тут блізка да ссівелага Чэгета…
А ўзімку тут не кожнаму прайсці.

…Што горы клічуць – у тым чыя віна?
Напэўна, усё наканавана зверху…
Мы з іншымі тут сёння на паверцы…
“И так несправедливо, что жизнь у нас одна”*.

---

**Радок з верша Юрыя Візбара*

## ПАВОДЛЕ ЎСПАМІНАЎ

Ні скептыцызму, ні тлуму, ні хцівасці
(Так усё добра зрабіла прырода)…
У пацалунках няма сарамлівасці,
У іх толькі бездань і асалода!

Можа яшчэ – аб мінулым трывога
(Зрэшты, навошта пра гэта нам думаць?)…
Стомленасць целаў – свайго і чужога –
Без адзіноты, адчаю і суму.

Лік той жанчыны – бы ў храмным прытворы.
Кветкамі пахне, нібыта ў полі…
Робяць тут глупствы і глупствы гавораць,
Але пачуцці ўжо не адолець…

***

Не баяцца ніякіх трывог,
Раздражнёнасць хаваць ад сяброў…
Нада мной і са мной – толькі Бог,
Што за справа мне да дактароў?
І нашто мне сцяжынка ў палях,
Калі Ён ужо вызначыў шлях…

***

Непрадказальны подых маланак,
Так, нечакана, на ўсе нябёсы.
Кветкі здзічэюць альбо завянуць,
Сябра зірне нязвыкла і скоса.

Не давядзе да фінала фразу,
Ці абарве, амаль на паўслове…
Што ты з іх возьмеш, з усіх, адразу…
(Як гэта будзе – на пальцах ці мове)?

…Слоў не знаходзіцца цёплых і шчырых,
Страчана ўсё. Бо згубілася вера…
Птушкі ізноў збіраюцца ў вырай,
Гэта пры тым, што за вокнамі чэрвень…
Зноў застанецца чыстай папера.

***

Было яшчэ далёка да бяды,
Хоць час непрадказальны і няўмольны.
Спявалі салаўі на ўсе лады,
І кветачкі ўздымаліся ў полі.

Вятры з далёкіх земляў дрэў не гнулі,
Прыходзіла жаданае цяпло.
І на ўзлеску я пачуў зязюлю…
А грошай у кішэнях не было!

***

Прахалодаю цягне ледзь-ледзь ад ракі,
Зімародак цікуе з-пад кручы.
Адгарэлі, бы зоркі, у траве светлячкі,
Кветкі дораць нам водар гаючы.

Мы губляем на сёння свае берагі,
Усё па-свойму, астатняе – трэсне!
І плывуць у тумане праз ліпень стагі,
І заходзяцца птушкі ад песень!

Калі гэта ты бачыў – скажы толькі, дзе
Між такімі ты быў берагамі?
Рыба плясне. Спалохае “лес у вадзе” –
Разыдзецца адценне кругамі.

Медным колерам – соснаў стагодніх ствалы.
Мы й да іх завіталі ў госці…
У хаце ў красным кутку на цвіку пасталы –
Дзядзька плёў іх падчас маладосці.

На паркане за вокнамі – чорны гаршчок
І гладыш круглым донцам угору.
І вішнёўка тут знойдзецца, і кумпячок,
І на стол тут кароткія зборы.

Гаспадар цябе хутка бярэ ў абарот:
Выпіць разам з гасцямі карціць…
А на хлеўчыку, што каля хаты, чарот
Злёгся добра і не шапаціць…

## ПРЫЭЛЬБРУССЕ

Далёка і радзіма, і сям’я,
І лёд пад вечар друзлы і нячысты…
На вышыні чатыры дзвесце я
Сустрэўся выпадкова з альпіністам.

Мужчына год пад трыццаць, можа, меў,
Быў нападпітку трошачкі, магчыма.
І я спытацца ў яго пасмеў –
Якая ёсць для радасці прычына?

На ўсе пытанні хлопец даў адказ
(Так проста гэта пры сваёй Айчыне):
“Я сёння ўжо ў сямідзясяты раз
Звадзіў турыстаў групу на вяршыню!”

Яму было не сумна аднаму,
Уніз ішоў і нос свой не тапырыў…
Як я зайздросціў дзецюку таму
У свае няпоўных шэсцьдзясят чатыры.